# Прайшло пасяджэнне Грамадска-кансультацыйнага (экспертнага) савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Мінсувязі

14 снежня 2016 года пад старшынствам Міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Папкова С.П. адбылося пасяджэнне Грамадска-кансультацыйнага (экспертнага) савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь (Грамадскі савет).

У пасяджэнні прынялі ўдзел Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Рыбак Андрэй Анатольевіч, Загадчык аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце , сувязі і прадпрымальніцтва Ледаковіч Віталь Рамуальдавіч, начальнікі структурных падраздзяленняў Мінсувязі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў "Інфармацыйнае грамадства", Тэлекамунікацыйнага галіновага саюза, асацыяцыі «Белінфакам», кіраўнікі РУП "Белтэлекам", СТАА «Беларускія хмарныя тэхналогіі», РУП «Нацыянальны цэнтр абмену трафікам» .

У рамках пасяджэння выступілі Нарэйка Андрэй Ігаравіч Старшыня праўлення асацыяцыі «Белінфакам» - пра фактары і ўмовы, якія аказваюць уплыў на рост аб'ёмаў і якасць прадастаўлення паслуг шырокапалоснага доступу ў Рэспубліцы Беларусь, у тым ліку з выкарыстаннем перадавых тэхналогій, Клюйкова Алена Георгіеўна - Старшыня Праўлення Тэлекамунікацыйнага галіновага саюза -
аб выкарыстанні аўтарскіх правоў пры трансляцыі тэлепраграм у сетках апаратараў электрасувязі, начальнік сектара ліцэнзавання Мінсувязі Івашкевіч Юрый Сяргеевіч - пра вынікі, парадак і праблемы пры правядзенні маніторынгу Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі апаратараў электрасувязі ў частцы рэтрансляцыі тэлепраграм, Сямашка Юрый Аляксандравіч - начальнік РУП «БелДІЭ» - аб выкарыстанні радыё-частотнага спектру.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/15-12-2016-1459*